качестве основного метода при написании исследования был использован описательно-аналитический метод.

**Результаты и их обсуждение.** В Перечне универсальных компетенций (далее – Перечень), опубликованном на сайте Республиканского института высшей школы, можно особо выделить компетенции УК-3 (Осуществлять коммуникации на иностранном языке для решения задач межличностного и межкультурного взаимодействия) и УК-4 (Работать в команде, толерантно воспринимать социальные, этнические, конфессиональные, культурные и иные различия) [1]. Однако работа над формированием данных компетенций на юридических факультетах, как правило, не имеет системного характера. Зачастую это обуславливается стереотипным мнением о том, что данная компетенция должна развиваться у студентов, обучающихся на лингвистических специальностях.

По нашему мнению, эффективным способом развития социокультурной компетенции у обучающихся, предусмотренной Перечнем, может стать корректировка локальных нормативных актов на базе внедренной в учреждении высшего образования системы менеджмента качеством. Так, основы формирования социокультурной компетенции обучающихся могут найти свое отражение в миссии, а также основных направления политики руководства в области качества и охраны труда.

В настоящее время нормативное закрепление социокультурной компетенции обучающихся в том числе на юридических факультетах носит в большей степени декларативный характер и требует выработки условий по внедрению в образовательный процесс университета данной компетенции как фактора повышения эффективности профессиональной подготовки будущих юристов.

Преподаватель юридических дисциплин должен обладать необходимым комплексом методических рекомендаций, направленных на формирование у обучающихся социокультурной компетенции. В этой связи предлагается на стадии разработки учебной программы внести соответствующую корректировку в части компонента учреждения высшего образования. В локальный нормативный акт, на основе которого преподаватели осуществляют разработку учебной программы, содержащий основные требования к ее наполнению, предлагается внести дополнение. Дополнение может быть оформлено в виде раздела «Социокультурный компонент» и содержать определение социокультурной компетенции, обоснование ее актуальности в современном образовательном процессе, а также базовые механизмы и способы мягкой корректировку образовательной программы с целью включению элементов, способствующих формированию у обучающихся социокультурной компетенции.

**Заключение.** Благодаря включению социокультурной компетенции в образовательный процесс на юридическом факультете учреждения высшего образования на этапах подготовки учебных программ, учебных планов, учебников и учебных пособий, методических рекомендаций, может быть ускорен процесс модернизации университета в рамках Концепции «Университет 4.0». Более эффективно данное включение будет проходить при условии разработки на уровне системы менеджмента качества вуза в соответствии с требованиями СТБ ISO 9001 и СТБ 18001, а также иных локальных нормативных актов.

1. Перечень универсальных компетенций для I ступени [Электронный ресурс] / www. edustandart.by - Режим доступа: https://edustandart.by/images/news/2020/pdf/perechen-uk-1.pdf. - Дата доступа: 28.01.2021.

## ПРАФІЛАКТЫКА КІБЕРБУЛІНГУ Ў ДЗЕЙНАСЦІ ПРАВААХОЎНЫХ СТРУКТУР

*С.В. Венідзіктаў, І.Л. Лукашкова*
*Магілёў, Магілёўскі інстытут МУС*

Інтэнсіўнае развіццё інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій спрыяе пераносу многіх негатыўных сацыяльных праяў у інтэрнэт-прастору, што стварае ўмовы для ўзнікнення форм псіхалагічнага гвалту, адной з якіх з’яўляецца кібербулінг. Большасцю аўтараў пад кібербулінгам разумеюцца наўмысныя, сістэматычныя, варожыя паводзіны асобы (групы асоб), якія ўключаюць абразу, запалохванне, прыніжэнне, хуліганства, што здзяйсняюцца з дапамогай інтэрнэт-тэхналогій у віртуальным асяроддзі. Мы прытрымліваемся трактоўкі паняцця,



Репозиторий ВГУ

прапанаванай Г.У. Салдатавай і А.Н. Ярміной: "агрэсіўныя, наўмысныя дзеянні, якія здзяйсняюцца групай асоб або адной асобай з выкарыстаннем электронных форм кантакту, паўтараюцца неаднаразова і маюць працягласць у часе, у дачыненні да ахвяры, якой цяжка абараніць сябе" [4, с. 20]. Хуткія тэмпы росту даступнасці Інтэрнэту для насельніцтва павялічваюць рэальную рызыку кібервіктымізацыі непаўнагадовых. Паводле дадзеных 2018 г., 95 % дзяцей з'яўляюцца інтэрнэт-карыстальнікамі, а 6 % непаўнагадовых ва ўзросце 9-16 гадоў станавіліся ахвярамі кібербулінгу [1]. Акрамя высокай уцягнутасці падлеткаў у сітуацыі кібербулінгу, фактарам сацыяльнай небяспекі выступае сур'ёзнасць і глыбіня яго негатыўных наступстваў, да якіх адносіцца зніжэнне школьнай паспяваемасці, прыніжаная самаацэнка, дыстрэс, фобіі і фрустрацыі, афектыўныя праявы, дэлінквентнасць, суіцыдальныя думкі і намеры. Гэта актуалізуе неабходнасць вывучэння кола пытанняў, якія тычацца кібербулінгу.

**Матэрыял і метады.** У межах нашага даследавання разглядаецца праца па прафілактыцы кібербулінгу, якая ажыццяўляецца праваахоўнымі структурамі Рэспублікі Беларусь, у прыватнасці – інспекцыяй па справах непаўнагадовых (ІСН). Аналізуецца заканадаўчая база падобнай дзейнасці і практыка правапрымянення, а таксама практычны вопыт ІСН і існуючыя праблемы ў дадзеным накірунку. Ужыты метады аналізу і абагульнення заканадаўства і нарматыўна-прававой дакументацыі, праведзены апытанні суб'ектаў прафілактычнай працы.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Дзейнасць па прафілактыцы правапарушэнняў непаўнагадовых, а таксама папярэджанню дэвіянтных паводзін у Рэспубліцы Беларусь рэгламентуецца Законам "Аб асновах сістэмы прафілактыкі безнагляднасці і правапарушэнняў непаўнагадовых" [2]. У аснове шматузроўневай сістэмы органаў, у сферу кампетэнцыі якіх уваходзяць пытанні прафілактыкі дэвіянтных паводзін непаўнагадовых, знаходзіцца асоба дзіцяці, яго правы і інтарэсы. Гэта значыць, што прапарцыйна характару і ступені праяў дэвіяцый паводзін непаўнагадовых дзяржаўныя структуры маюць права прымаць адэкватныя меры па карэкцыі. Згодна з заканадаўствам, паралельна з індывідуальнай прафілактычнай працай рэалізуецца сістэма сацыяльных, прававых і іншых мер, накіраваных на выяўленне і ліквідацыю прычын і ўмоў, што садзейнічаюць фарміраванню дэвіянтных паводзін.

Інспекцыі па справах непаўнагадовых, што функцыянуюць у рамках органаў унутраных спраў (ОУС) Рэспублікі Беларусь, з'яўляюцца падраздзяленнямі, якія ажыццяўляюць меры па прафілактыцы правапарушэнняў непаўнагадовых і супрацьдзеянню развіццю дэвіянтных форм паводзін. У гэтай сувязі задачы ІСН наступныя:

– правядзенне індывідуальнай прафілактычнай працы ў адносінах да непаўнагадовых і іх законных прадстаўнікоў (бацькоў, апекуноў і г. д.);

– выяўленне асоб, якія ўцягваюць непаўнагадовых у здзяйсненне правапарушэнняў або ўчыняюць у адносінах да іх правапарушэнні;

– выяўленне непаўнагадовых, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, у тым ліку маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне;

– інфармаванне зацікаўленых аб фактах правапарушэнняў непаўнагадовых, іх прычынах;

– паведамленне бацькам, апекунам ці папячыцелям непаўнагадовых аб дастаўленні апошніх у падраздзяленні ОУС у сувязі са здзяйсненнем імі правапарушэнняў;

– вывучэнне стану выхаваўчай работы з непаўнагадовымі, якія стаяць на ўліку ў ІСН, у навучальных, культурна-забаўляльных, спартыўных установах, іншых арганізацыях, гуртках і клубах па месцы жыхарства, а таксама па месцы вучобы (працы) непаўнагадовых;

– дастаўленне ў падраздзяленні ОУС непаўнагадовых, якія здзейснілі правапарушэнні;

– унясенне прапаноў у дзяржаўныя органы і іншыя арганізацыі аб ліквідацыі прычын і ўмоў, якія садзейнічаюць учыненню непаўнагадовымі правапарушэнняў;

– вядзенне ўліку непаўнагадовых, з якімі праводзіцца індывідуальная прафілактычная работа, іх бацькоў, усынавіцеляў, апекуноў ці папячыцеляў, якія не выконваюць або неналежным чынам выконваюць абавязкі па выхаванні і ўтрыманні непаўнагадовых;

– збор і абагульненне інфармацыі, неабходнай для складання статыстычнай справаздачнасці, і г. д. [2].

ІСН праводзіць індывідуальную прафілактычную працу ў дачыненні да непаўнагадовых, якія дасягнулі 10 гадоў. Аднак фактычна ў "групе рызыкі" ў дачыненні да кібербулінгу знаходзяцца непаўнагадовыя, пачынаючы з 8-гадовага ўзросту (і нават раней), якія становяцца актыўнымі карыстальнікамі інтэрнэт-сервісаў. Падчас правядзення індывідуальнай прафілактычнай работы з падлеткамі ІСН ва ўзаемадзеянні з іншымі падраздзяленнямі ОУС:

Рэпазіторый БДУ

высвятляюць лад жыцця, паводзіны і сувязі непаўнагадовага; тлумачаць непаўнагадовым і іх бацькам, апекунам ці папячыцелям наступствы здзяйснення правапарушэнняў; выяўляюць непаўнагадовых, якія маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне [3].

Як вынікае з актуальных нарматыўных прававых актаў і арганізацыйнай структуры Міністэрства ўнутраных спраў, у складзе ОУС няма спецыяльных падраздзяленняў, якія б змагаліся з супрацьпраўнымі дзеяннямі падлеткаў у Інтэрнэце. Такая задача ўваходзіць у сферу адказнасці ІСН і з'яўляецца адносна новай. У цэлым, арганізацыйна-метадычныя аспекты папярэджання падлеткавага кібербулінгу ў працы ІСН могуць быць апісаны трыядай "маніторынг – выяўленне рызык – прафілактыка". Задача процідзеяння кібербулінгу вырашаецца ў такім выпадку паралельна з рэалізацыяй іншых задач, якія стаяць перад інспекцыяй. Асноўныя мерапрыемствы ў гэтым напрамку:

1. Маніторынг сацыяльных сетак і іншай сеткавай актыўнасці непаўнагадовых, у дачыненні да якіх вядзецца індывідуальная выхаваўчая праца ("група рызыкі"). Дадзеная катэгорыя падлеткаў шырокая, дэвіяцыі яе паводзін не абмяжоўваюцца праявамі кібербулінгу, што пашырае пералік задач маніторынгу і ўскладняе выяўленне патэнцыйных праблем.

2. Узаемадзеянне з настаўнікамі ва ўстановах сярэдняй адукацыі, навучанне іх метадам маніторынгу сеткавай актыўнасці вучняў. У гэтай сферы шмат залежыць і ад узроўню развіцця інфармацыйна-камунікатыўнай культуры педагогаў (іх медыйнай граматнасці), якая прадвызначае кампетэнтнасць і ўсвядомленасць ў супрацьдзеянні негатыўным з'явам у віртуальнай прасторы.

3. Работа з бацькамі непаўнагадовых (не толькі з "групы рызыкі"), навучанне іх метадам маніторынгу сеткавай актыўнасці дзяцей. У гэтым кірунку важна данесці тэзіс аб тым, што выяўленне інтэрнэт-агрэсара абавязкова павінна суправаджацца вызначэннем рэальных альбо патэнцыйных ахвяр, якія могуць быць схаванымі, не адносіцца да "групы рызыкі", не выяўляць прыкмет дэвіянтных паводзін.

4. Правядзенне псіхалагічнага маніторынгу, выяўленне падлеткаў, якія маюць схільнасці да праяў розных форм дэвіянтных паводзін, іх катэгарызацыя, стварэнне і актуалізацыя баз дадзеных. Гэты накірунак рэалізуецца ва ўзаемадзеянні з сацыяльна-педагагічнымі і псіхалагічнымі службамі ўстаноў адукацыі.

5. Данясенне да непаўнагадовых прававых наступстваў кібербулінгу, г. зн. азнаямленне іх з нормамі адміністрацыйнага і крымінальнага заканадаўства, якія дзейнічаюць у гэтай сферы, стварэнне ў вучняў уяўлення аб магчымых спосабах абароны сябе ад патэнцыйных выпадкаў кібербулінгу. Важна таксама знаёмства падлеткаў з рэальнымі гісторыямі праяў кібербулінгу, лакалізаванымі ў звыклым для іх сацыяльным асяроддзі. Падобныя гісторыі агучваюцца падчас штогадовай міжведамаснай прафілактычнай акцыі "Сябруем з Законам!", якая праводзіцца ў рамках Комплекснага плана мерапрыемстваў па прафілактыцы безнагляднасці, правапарушэнняў непаўнагадовых. Дзейсным інструментам прафілактыкі з'яўляецца сацыяльная рэклама, выкарыстанне сучаснага мультымедыйнага кантэнту, групавы адкрыты аналіз рэальных (ці змадэліраваных) профіляў у сацыяльных сетках, якія належаць агрэсарам альбо ахвярам кібербулінгу.

Цэласны алгарытм процідзеяння падлеткаваму кібербулінгу ў дзейнасці ІСН да цяперашняга часу не выпрацаваны, што абумоўлена адноснай навізной праблемы, неабходнасцю апрабацыі існуючых методык да сацыяльных рэалій, складанасцю вызначэння і каардынацыі сумесных дзеянняў органаў унутраных спраў і іншых дзяржаўных структур, а таксама грамадскіх фарміраванняў. Напрыклад, у 2018 г. Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь была прапанавана праграма ўзаемадзеяння з установамі сярэдняй адукацыі, накіраваная на супрацьдзеянне кібербулінгу. Сумесна з Міністэрствам адукацыі распрацаваны інструкцыі для педагогаў, накіраваныя на выяўленне выпадкаў інтэрнэт-пераследу. Згодна з прапанаваным алгарытмам, настаўнікі павінны паведамляць аб прыкметах ганення бацькам, апекунам, папячыцелям, а таксама ў ОУС.

У 2017 г. па ініцыятыве МУС і Упраўлення ААН па наркотыках і злачыннасці быў распачаты праект па стварэнні адзінага інфармацыйнага сацыяльнага рэсурса POMOGUT.BY. Партал, прызначаны для дзяцей рознага ўзросту, бацькоў і педагогаў, прапануе інфармацыю пра бяспечныя паводзіны ў Інтэрнэце, спосабы абароны ад кібербулінгу. Інфармацыйную, псіхалагічную і прававую дапамогу ў забяспечвае ананімны чат з псіхолагамі і юрыстамі. Міністэрства адукацыі рэкамендуе выкарыстоўваць рэсурс у сярэдніх навучальных установах.



Рэпазіторый БГУ

Супрацоўніцтва ІСН ажыццяўляецца таксама з Рэспубліканскім цэнтрам псіхалагічнай дапамогі, які праводзіць лекторыі па пытаннях прадухілення кібербулінгу, падтрымкі дзяцей і падлеткаў, што сутыкнуліся з пераследам. Падчас лекцый раскрываецца змест розных сеткавых пагроз, спосабы эфектыўнага бацькоўскага ўзаемадзеяння з дзецьмі і падлеткамі ў Інтэрнэце. З лютага 2020 г. Цэнтр рэалізуе адукацыйна-інфармацыйны праект для падлеткаў "Бяспечныя зносіны – навык XXI стагоддзя", у які ўключаны блок па развіцці навыкаў бяспечных паводзін у Інтэрнэце. На занятках вучні знаёмяцца з псіхалагічнымі і тэхнічнымі спосабамі абароны ад кіберпагроз, развіваюць навыкі эфектыўнай камунікацыі, атрымліваюць кампетэнцыі медыйнай граматнасці. Падлеткі актыўна вырашаюць кейсы, звязаныя з рознымі праблемнымі сітуацыямі, якія могуць узнікнуць у інтэрнэт-карыстальнікаў, вызначаюць эфектыўныя спосабы прадухілення і вырашэння падобных сітуацый. Праца па інфармаванні аб правілах бяспечных паводзін у Інтэрнэце вядзецца ў трох групах: бацькі, педагогі, навучэнцы. Падобныя ініцыятывы, на наш погляд, павінны ажыццяўляцца ва ўзаемадзеянні з ІСН: падлеткі, якія ўваходзяць у групу рызыкі, могуць самі актыўна ўключацца ў прафілактычныя мерапрыемствы.

**Заключэнне.** Вышэйпералічаныя неспрыяльныя наступствы сведчаць пра тое, што кібербулінг выступае фактарам пагрозы ў дачыненні да бяспекі непаўнагадовых. Гэта актуалізуе неабходнасць распрацоўкі навукова абгрунтаваных прафілактычных мерапрыемстваў, накіраваных на мінімізацыю праяў інтэрнэт-гвалту і іх уплыву на ўдзельнікаў гэтай з'явы, забеспячэнне кібербяспекі дзяцей і падлеткаў. Эфектыўнасць працы супрацоўнікаў ІСН па папярэджанні падлеткавага кібербулінгу вызначаецца мэтанакіраванасцю і сістэматычнасцю правядзення адпаведных мерапрыемстваў, іх навукова абгрунтаваным зместам, а таксама максімальным улікам рэальных патрэб непаўнагадовых.

1. Лукашкова, И. Л. Кибербуллинг в подростковой среде: проблема профилактики [Электронный ресурс] / И. Л. Лукашкова, М. Н. Сулимова // Актуальные проблемы специального и инклюзивного образования детей и молодежи : матер. IV Междунар. науч.-практ. конф., ТИИ им. А. П. Чехова, 28 февр. 2020 г. – Р.-на-Д. – Таганрог : Изд-во ЮФУ, 2020. – С. 223–226.

2. Об основах системы профилактики безнадзорности и правонарушений несовершеннолетних : Закон Респ. Беларусь от 31 мая 2003 г. № 200-З : в ред. от 9 января 2017 г. № 18-З // АПС «Бизнес-Инфо» : Беларусь [Электронный ресурс] / ООО «Профессиональные правовые системы». – Мн., 2021.

3. Об утверждении Инструкции о порядке выявления несовершеннолетних, нуждающихся в государственной защите : постановление Министерства образования Респ. Беларусь, 28 июля 2004 г., № 47 : с изм. и доп. // АПС «Бизнес-Инфо» : Беларусь [Электронный ресурс] / ООО «Профессиональные правовые системы». – Мн., 2021.

4. Солдатова, Г. У. Кибербуллинг: особенности, ролевая структура, детско-родительские отношения и стратегии совладания / Г. У. Солдатова, А. Н. Ярмина // Национальный психологический журнал. – 2019. – № 3 (35). – С. 17–31.

## БИНАРНЫЕ УЧЕБНЫЕ ЗАНЯТИЯ В ПРОЦЕССЕ ПЕРЕПОДГОТОВКИ СЛУШАТЕЛЕЙ СПЕЦИАЛЬНОСТИ «ПСИХОЛОГИЯ»

*А.А. Ганкович, Е.П. Милашевич*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*

Для совершенствования качества профессиональной переподготовки специалистов в настоящее время требуется внедрение современных технологий в организацию учебного процесса. Следует также подчеркнуть, что современное образование должно быть вариативным, отвечающим не только меняющимся запросам общественной практики, но и личным и профессиональным ожиданиям обучающихся взрослых.

Наиболее действенной, нетрадиционной формой работы со слушателями мы считаем бинарные учебные занятия, как ресурс сотрудничества преподавателей и обучаемых. В классическом понимании бинарные занятия (лекции, практические, лабораторные) – это диалог между двумя преподавателями, каждый из которых излагает свое видение изучаемой темы и ее основных проблем, активизируя при этом и учебную группу. По мнению исследователей, использование лекции-диалога в обучении соответствует ориентации современной высшей школы на гуманистическую и гуманитарную направленность образования, на отход от «валовой» подготовки специалистов и переход к индивидуализированному обучению, на обеспечение взаимосвязи учебно-воспитательной и научной работы [1, с. 10].

Анализ работ в области практического использования активных методов обучения показал, что бинарные учебные занятия рассматриваются с разных точек зрения. Бинарное занятие как форма инновационного обучения (Андреев В.А., Овчинников В.А.); как способ интерак-



Репозиторий ВГУ